ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

'90 ЧАЦВЕР 20 СНЕЖНЯ № 35 (1664)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

Чырвоны радок

Два надзвычай важныя пытанні абмяркоўваліся на апошнім пасяджэнні вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна: аб эфектыўнасці работы аспірантуры і дактарантуры па падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў і аб стварэнні малых прадпрыемстваў ва універсітэце.

Сярод арганізацыйных пытанняў — абранне па конкурсу і прысваенне супрацоўнікам БДУ вучоных званняў.

* * *

У кафэ «Гаўдэамус» прайшоў агульнауніверсітэцкі спартыўны вечар. Безумоўна, самым прыемным момантам яго было ўзнагароджанне пераможцаў спаборніцтваў.

* * *

Дзякуючы універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі мелі магчымасць сустрэцца з аглядальнікамі штотыднёвіка «Совершенно секретно». Яўген Додалеў і Дзмітрый Ліханаў падзяліліся з прысутнымі сакрэтамі папулярнасці свайго выдання, адказалі на пытанні, расказалі аб тэмах, якія мяркуюць узняць на старонках штотыднёвіка ў будучым.

Для тых, хто адсутнічаў

## ПАРТЫЯ — ГАСПАДАРНІК?

Хоць сакратар парткома БДУ В. М. Анішчык перакананы, што партыйны форум павінен быў не вырашаць гаспадарчыя задачы, а распрабаваць разблытаць няпросты клубок палітычных пытанняў, тым не менш не ўтрымаўся, каб яшчэ раз не выказваць набалелае. Ён прывёў словы Ф. Жоліо-Кюры аб тым, што краіна, якая не развівае навуку, ператвараецца ў калонію. А пацвярджэннем нядбайных адносін да вышэйшай школы з'яўляецца універсітэцкі даўгабуд.

Віктар Міхайлавіч выказаў таксама асцярогу, што ва ўмовах рынку студэнты, якія не могуць пахваліцца сваім матэрыяльным становішчам і цяпер, наогул акажуцца за рысай беднасці. Стыпендыя, якая пасля Новага года складзе прыкладна 60 рублёў, відавочна ніжэй пражытачнага мінімуму. Каб бедны студэнт не дайшоў да жабрацтва, В. М. Анішчык прапанаваў партыі падтрымаць яго матэрыяльна — выдзеліць для гэтых мэт — 2—3 мільёны рублёў.

Усе, хто прысутнічаў на сустрэчы з дэлегатам XXXI з'езда Кампартыі рэспублікі, былі салідарныя з Віктарам Міхайлавічам. Шкада толькі, што ў зале для пасяджэнняў вучонага савета усе крэслы, акрамя дзевяці, аказаліся пустымі. Але выступаючы наўрад ці разлічваў на большае: аб зніжэнні палітычнай актыўнасці гаворыць і той факт, што раней дзверы партыйнага камітэта літаральна не зачыняліся і за дзень яго наведвалі, як паведаміў М. Г. Елісееў, які ў свой час таксама быў партыйным сакратаром і вёў статыстыку прыёмаў, каля 80 чалавек, а цяпер, па словах В. М. Анішчыка, гэта лічба крыху пераваьвае за дзесяць.

Гэта і зразумела. У той час (не такі ўжо і далёкі) партыя вырашала амаль усе пытанні: і гаспадарчыя, і кадравыя, і палітычныя. Ды і са скаргамі чалавек перш чым куды-небудзь звярнуцца, бег у партком. А зараз спахапіліся і прыйшлі да вываду, што гэта надта многа для парткомаў, і пакінулі ім толькі палітычныя пытанні.

Тыя, хто вёў на сустрэчы дыялог з сакратаром, прапанавалі яму наладзіць цыкл лекцый, якія дапамаглі б камуністам і беспартыйным разабрацца ў сённяшняй складанай палітычнай сітуацыі.

В. М. Анішчык напаследак заўважыў, што камуністы чакалі ад з'езда большага і многія былі расчараваны яго ходам. І наогул, калі партыя і надалей будзе займацца вырашэннем гаспадарчых пытанняў (з'езд даў падставы для такіх вывадаў), то наўрад ці атрымаецца які-небудзь зрух да лепшага ў нашым жыцці.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## МЫ — ПЕСІМІСТЫ?

Аб гэтым сведчыць і статыстыка. Па выніках сацыялагічных даследаванняў, якія нядаўна закончыла лабараторыя праблем маладзёжных рухаў Сацыялагічнага навукова-даследчага цэнтра БДУ імя У. І. Леніна з удзелам супрацоўнікаў аддзела даследаванняў маладзёжных праблем ЦК ЛКСМБ, 69 працэнтаў беларускіх студэнтаў пакінуў аптымізм у ацэнцы нашай рэчаіснасці. Галоўныя сярод адмоўных эмоцый — незадаволенасць і няўпэўненасць. Толькі кожны пяты студэнт мае надзею на перамены да лепшага, але пачуццё гэта настолькі няўстойлівае, што ў любы момант можа змяніцца расчараваннем. У чым жа справа?

Даследчыкі лічаць, што, у першую чаргу, гэта звязана з пераацэнкай гістарычнай спадчыны. І, безумоўна, з тым, што перабудова, стаўшы «адлігай» у галіне галоснасці і дэмакратызацыі грамадства, нічога не зрабіла для павышэння матэрыяльнага ўзроўню жыцця людзей (асабліва студэнцтва), стабілізацыі палітычнай сітуацыі.

Задаўшыся мэтай выявіць змены, якія адбыліся ў свядомасці студэнцтва рэспублікі за пяць гадоў перабудовы, чаго яны чакаюць ад будучага і як ацэньваюць дзень сённяшні, вучоныя апыталі больш тысячы навучэнцаў з чатырнаццаці ВНУ рэспублікі. Меркаванні іх выдадзены асобным зборнікам «Беларускае студэнцтва: пяць гадоў перабудовы». У ім пяць раздзелаў: «Вобраз мінулага і вобраз будучага ў свядомасці студэнтаў», «Міжнацыянальныя адносіны ў студэнцкім асяроддзі», «Студэнцкае самакіраванне: праблемы станаўлення і развіцця», «Студэнцкая сям'я», «Змест і структура вольнага часу студэнцкай моладзі».

Наказ на дарогу

## Шлюб не па разліку

Сённяшні імклівы час і без таго насычаны рознымі падзеямі. Напэўна, больш важнымі, чым гэта. І ўсё ж для маладых спецыялістаў-бібліятэкараў з БДУ, БПІ, МРТІ і інстытута культуры менавіта гэта пасвячэнне ў прафесію надоўга застанецца ў памяці разам з першымі радкамі працоўнай біяграфіі. Як і працітаваныя дырэктарам бібліятэкі І. У. Арэхоўскай словы акадэміка Д. С. Ліхачова: «Культура застанецца тады, калі не будзе універсітэтаў, інстытутаў, навуковых устаноў, але выжывуць бібліятэкі».

Яна паспрабавала паказаць маладым дзяўчатам прыгажосць сваёй прафесіі (ёй Ірына Уладзіміраўна аддала больш за трыццаць гадоў), якая з'явілася разам з зараджэннем пісьменнасці і ўзнікненнем неабходнасці захавання кніг. У свой час бібліятэкарамі былі такія славутасці, як Гётэ, Кант, Крылоў і іншыя. Яны ганарыліся сваёй прафесіяй.

— Няхай і вас на працягу ўсяго працоўнага шляху суправаджае гэта пачуццё,— пажадала І. У. Арэхоўская.— Вырашыўшы звязаць свой лёс з бібліятэкай, вы заключылі шлюб не па разліку, а па каханню, і ён абавязкова павінен быць шчаслівым.

Пасля выступлення першага прарэктара БДУ П. Д. Кухарчыка ўрачыстая частка была закончана. Вядучыя спрабуюць высветліць, ці правільны выбар зрабілі бібліятэкары, ці не расчараваліся? Пачуўшы станоўчы адказ, прапануюць дзяўчатам адказаць на некаторыя пытанні: «Якія дзеясловы маюць адносіны да бібліятэкі», «Назавіце колер вазы, у якой стаяць кветкі ля ўваходу», «Колькі мужчын працуе ў бібліятэцы?». Яны крышачку бянтэжацца, але адказваюць даволі дакладна і трапна. Відаць, не пазбаўлены пачуцця гумару, без якога немагчыма работа з людзьмі. Гэта пацвердзіла і інсцэніраваная клятва-адказ.

І напаследак маладых калег павіншавалі ветэраны працы. Дарэчы, адна з іх — намеснік дырэктара Раіса Іванаўна Пустаход толькі тут пачула аб узнагароджанні яе медалём «Ветэран працы».

..Урачыстасць закончана. Для шасці выпускніц Інстытута культуры працоўныя будні пачнуцца ва універсітэцкай бібліятэцы.

Т. КАРБАЧОВА.

Запрашальны білет

## У некаторым царстве

Паверце ў чароўную сілу посаха Дзеда Мароза і... вы ў некаторым царстве. Такое магчыма толькі пад Новы год — ён заўсёды багаты на цуды.

Якога б узросту мы ні былі, усё роўна чакаем яго з нецярплівасцю. А калі ўбачым рознакаляровую прыгажуню — ёлку, так і хочацца працягнуць руку і намацаць крышачку схаваны, але так, каб лёгка было знайсці, падарунак.

Як ні цяжка даводзіцца членам камісіі садзеяння сям'і і школе прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў, яны не расчаруюць нашых дзетак і сёлета. Падарунак абавязкова будзе. Магчыма, не такі багаты, як раней: з «Чырвонай Шапачкай», шакаладкамі, мандарынамі і зефірам, але, упэўнена, ён прынясе дзецям не менш радасці.

Дарэчы, прыемным навагодняе свята будзе не толькі для самых маленькіх (падарункі — іх колькасць дасягнула ў гэтым годзе 2500 — атрымаюць толькі дзеткі да сямі гадоў). Тыя, хто крышачку абагнаў «цукерачны» ўзрост», змогуць адправіцца ў двухдзённую экскурсію ў Маскву, Рыгу, Калінінград, Львоў, Брэст.

А пачнуцца Навагоднія прыгоды на ранішніках, якія адбудуцца 29 і 30 снежня ў 11-й гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса. Маладзёжны цэнтр «Арыенцір» і вядучая праграмы Інэса Апалайка запрасілі ў госці Дзеда Мароза, Снягурку і многіх герояў любімых казак. Яны будуць рады вадзіць з вамі карагод вакол ёлкі, дзеці. Асабліва, калі вы завітаеце на свята ў карнавальных касцюмах.

І яшчэ, крыху не запамятавала. Самыя паслухмяныя трапяць 23 снежня ў Рускі тэатр на спектакль «У некаторым царстве, у недацёпнай дзяржаве».

Э. АНІСЕНКА,
старшыня камісіі садзеяння сям'і і школе прафкома супрацоўнікаў.



Яны прыляцелі спецрэйсам з Вены — 76 чалавек, якія ўдзельнічалі ў праграме аўстрыйскай дзяржаўнай дабрачыннай арганізацыі «Ігвсвер». Мэта — павесяліць нашых дзяцей, наладзіць ім калядныя святы і ўручыць падарункі. Балюча і сорамна было глядзець, як радаваліся дзеці самым звычайным рэчам — цукеркам, печыву, кансервам. Але ж гэта нам ужо не ў навіну...

Фота С. ГРЫЦА.





Вы чулі?

## Добры вечар — шчодры вечар!

Хочаце даведацца пра Каляды? Калі ласка, запрашаем на святочную віктарыну «Беларускія каляды» (вялікая куцця, народныя гульні і спевы, жарты і пажаданні).

Калядны час — час варажбы, цэнтральнае зімовае свята!

Спяшайцеся! Чакаем вас 27 снежня на геафаку а 18-й гадзіне.

УНІВЕРСІТЭЦКАЯ РАДА ТЭМ

Беларусізацыя ў ВНУ

*Сёння мы апынуліся перад неабходнасцю ўсямернага паглыблення беларускага нацыянальнага адраджэння. Без гісторыі няма будучага. Значную ролю ў дасягненні пастаўленых мэтаў будзе адыгрываць тое, у якой ступені мы ўлічым ў сваёй практычнай дзейнасці ўсе станоўчыя і адмоўныя моманты, якія мелі месца пры правядзенні беларусізацыі ў 20-х гадах...*

# Як гэта было...

Як вядома, пытанне аб заснаванні першага на тэрыторыі Беларусі універсітэта вырашалася некалькі гадоў. Аднак па розных прычынах урачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітта адбылося толькі 30 кастрычніка 1921 года, а ўжо з 1 лістапада ў ім пачаліся рэгулярныя заняткі.

Трэба адзначыць, што рабочы факультэт (рабфак) пачаў дзейнічаць яшчэ да адкрыцця БДУ, з чэрвеня 1921 года. Сярод першых слухачоў рабфака беларусаў налічвалася ўсяго 79. Размеркаванне студэнтаў усіх факультэтаў БДУ па нацыянальнасці ў 1922 годзе адлюстроўвалася ў наступных лічбах: беларусаў — 31 працэнт, яўрэяў — 63 працэнты, рускіх — 5 працэнтаў, іншых — 1 працэнт. Асноўная прычына непрапарцыянальнасці нацыянальнага саставу студэнцтва БДУ у тым, што ВНУ рэспублікі з самога пачатку сваёй дзейнасці камплектаваліся часцей за ўсё з рабочых і наогул гарадскога насельніцтва, сярод якога беларусаў было даволі мала. Гэта ў далейшым негатыўна ўздзейнічала на правядзенне беларусізацыі.

Няпростай задачай у першыя гады работы універсітэта было ўкамплектаванне кафедр і секцый высокакваліфікаванымі выкладчыкамі. Галоўныя выкладчыцкія пасады на факультэтах грамадскіх навук і медыцынскім займаліся ў пачатку 20-х гадоў вучонымі з Маскоўскага, Кіеўскага, Казанскага, Смаленскага універсітэтаў, сярод якіх было нямала сапраўды добрых спецыялістаў у сваіх галінах навукі. Пры адкрыцці універсітэта ў яго штаце налічвалася 14 прафесараў, 13 выкладчыкаў і 12 лектараў па розных мовах. Зразумела, што, як і сярод студэнцтва, у настаўніцкім персанале БДУ пераважалі прадстаўнікі небеларускіх нацыянальнасцей. Да таго ж, абсалютная іх большасць зусім не ведала беларускай мовы, асабліваcцей працы на Беларусі. У сярэдзіне 20-х гадоў сярод усіх прафесараў універсітэта (31 чалавек) беларус быў толькі адзін. Беларусы складалі большасць толькі сярод выкладчыкаў — 11 з 21. Спецыфіка нацыянальнага саставу настаўніцкага персаналу універсітэта таксама, як і склад студэнцтва, зразумела, стрымлівала здзяйсненне задач беларусізацыі.

Пераход да практычнага выканання асноўных мэт беларусізацыі ў ВНУ рэспублікі пачаўся пасля прыняцця адпаведных пастаноў і рашэнняў на вышэйным дзяржаўным узроўні. Афіцыйна курс на беларусізацыю розных арганізацый і ўстаноў у межах усёй БССР быў зацверджаны на Пленуме ЦК КП(б)Б і на другой сесіі ЦВК БССР VI-га склікання, якія адбыліся ў ліпені 1924 года.

Менавіта з гэтага часу ў праграмы выкладання ў ВНУ і тэхнікумах рэспублікі ўводзілася гісторыя і геаграфія Беларусі, курсы беларускай мовы. Упершыню ўлетку 1924 года пры залічэнні абітурыентаў у ВНУ на рабфакі патрэбна было валодаць беларускай мовай, яе ўнеслі ў лік прадметаў спецыяльнага калоквіуму, які праводзіўся пры паступленні.

У вышэйшых навучальных установах з сярэдзіны 20-х гг. выкладанне многіх прадметаў паступова пераводзілася на беларускую мову. Сярод факультэтаў універсітэта найбольшыя поспехі ў беларусізацыі мелі месца на педфаку. Напрыклад, калі на розных кафедрах педагагічнага факультэта БДУ у 1925 годзе на беларускай мове выкладалася 13 дысцыплін, то у 1926 — ужо 57. На яўрэйскай мове ў гэты час на адпаведнай секцыі педфака чыталіся ўсе 12 дысцыплін па гісторыі, літаратуры і мове.

Акрамя пераводу выкладання вучэбных прадметаў на беларускую мову, складанай задачай беларусізацыі з'яўлялася прыцягненне да працы ў ВНУ настаўнікаў, якія б ведалі беларускую мову, а таксама вывучэнне студэнцтвам і выкладчыцкім персаналам мовы большасці насельніцтва Беларусі.

Так, ужо ў 1922 годзе на рабфаку БДУ быў арганізаваны гурток беларускай культуры, выпускалася насценгазета, у якой значная частка матэрыялаў друкавалася на беларускай мове. Пры заканчэнні курса педфака БДУ студэнты павінны былі здаць экзамен па беларускай мове. Тыя навучэнцы, хто адразу яго не вытрымлівалі, маглі быць пакінуты на другі год для паглыбленага вывучэння беларускай мовы.

Адным са шляхоў павелічэння колькасці студэнтаў-беларусаў у БДУ было правядзенне праверак. У выніку здзяйснення гэтага не вельмі прыемнага для навучэнцаў мерапрыемства ў 1924 годзе з медыцынскага факультэта універсітэта было выключана 23 працэнты ўсіх студэнтаў. Адпаведныя даныя па факультэтах педагагічным і грамадскіх навук склалі 21 і 48 працэнтаў. Падобныя меры нярэдка выклікалі адмоўныя пачуцці з боку прадстаўнікоў небеларускага студэнцтва. Некаторыя крыніцы даюць права сцвярджаць, што ў другой палове 20-х гадоў частка студэнтаў ВНУ рэспублікі у тым ліку і БДУ, негатыўна адносілася да беларусізацыі, а часам заўважалася і яўнае супраціўленне правядзенню гэтай палітыкі.

Іншы раз выпадкі падобнага роду мелі месца і сярод выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Гэтыя з'явы былі выкліканы ў значнай меры незадавальненнем настаўнікаў небеларускай нацыянальнасці некаторымі патрабаваннямі да іх, звязанымі з правядзеннем беларусізацыі. Так, на адным з Пленумаў ЦК КП(б)Б (восень 1924 года) была прынята пастанова, у якой прадугледжвалася, што «пры замяшчэнні вакантных пасад прафесараў, настаўнікаў, асістэнтаў, ардынатараў і інш. навуковых працаўнікоў вышэйшых вучэбных устаноў, перавагу даваць асобам, якія ведаюць беларускую мову». Кіраўніцтва БДУ, напрыклад, абавязала ўсіх выкладчыкаў, асістэнтаў, ардынатараў вывучыць беларускую мову да 1 кастрычніка 1926 года. Заўважым адразу, што гэтая задача не была выканана. Нярэдка беларусізацыя ў ВНУ праводзілася вельмі павярхоўна, фармальна. І сярод іншых вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі працэнт беларусізацыі ў БДУ быў некалькі вышэйшым. У 1926 годзе гэтая лічба складала 14 працэнтаў, у сельскагаспадарчай акадэміі — 10, у Віцебскім ветэрынарным інстытуце — 1,9 працэнта. Але універсітэцкая лічба была невысокай у параўнанні з тымі, што меліся ў сярэдніх школах і дашкольных установах Беларусі.

У канцы 20-х гадоў працэс беларусізацыі ВНУ Беларусі амаль не разгортваўся. У 1928 годзе студэнты-беларусы складалі тут 57,1 працэнта ад агульнай колькасці навучэнцаў. Нават тыя выкладчыкі і студэнты, хто карыстаўся беларускай мовай у час заняткаў, рэдка ўжывалі яе па-за сценамі ВНУ.

У далейшым, на пачатку 30-х гадоў, працэс беларусізацыі фактычна быў цалкам згорнуты, а цэнтр увагі пераносіўся на актывізацыю барацьбы з так званым «беларускім буржуазным нацыянал-дэмакратызмам». Такім чынам, беларусізацыя ВНУ, як і большасці ўстаноў БССР, мела незакончаны, непаслядоўны характар і была штучна спынена адміністрацыйнымі метадамі.

**Эдуард ДУБЯНЕЦКІ,**
**навуковы супрацоўнік НДЛ гісторыі БССР.**

# ЗВАРОТ

## Савета старшыняў прафкомаў вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска да Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР

Мы, старшыні прафкомаў вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска, аб'яднаўшыся ў Савет і выпрацаваўшы адзіны пункт гледжання на сітуацыю, якая склалася сёння ў рэспубліцы і краіне, ад імя шматтысячных калектываў прафесарска-выкладчыцкіх, навуковых і тэхнічных работнікаў заяўляем:

1. Нацыя, якая не клапоціцца аб усямерным развіцці і ўмацаванні свайго навукова-інтэлектуальнага патэнцыялу, не здольна дынамічна развівацца і, у канчатковым выніку, асуджана на пагібель.

2. Прамаруджванне ў прыняцці кардынальных рашэнняў па пытаннях умацавання матэрыяльнай базы народнай адукацыі, паляпшэння сацыяльнага забеспячэння выкладчыкаў і супрацоўнікаў вышэйшых навучальных устаноў абернецца незаменнымі стратамі для дзяржавы ў будучым. Ужо зараз вызначыўся працэс адтоку самых таленавітых і кваліфікаваных работнікаў у кааператывы, малыя і сумесныя прадпрыемствы і г. д., а з прыняццем закону аб выездзе будзе страчаны цвет выкладчыцкай і навуковай моладзі, замена якой запатрабуе каласальных затрат і намаганняў, калі будзе наогул магчыма.

3. Зніжэнне ўзроўню кваліфікацыі выкладчыцкага саставу аўтаматычна выкліча зніжэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў з усімі зыходзячымі з гэтага вынікамі для прамысловасці, народнай адукацыі, медыцыны і грамадства ў цэлым. Ствараецца замкнутае кола, разрыў якога будзе патрабаваць і велізарных затрат, і неймаверных намаганняў.

Зыходзячы са сказанага вышэй, мы патрабуем:

1. Рашуча і беспаваротна адмовіцца ад астатковага прынцыпу фінансавання народнай адукацыі, сацыяльнага забеспячэння яе работнікаў.

2. Павялічыць адлічэнні ў 1991 годзе на народную адукацыю і вышэйшую школу да 10 працэнтаў нацыянальнага даходу рэспублікі, са штогадовым ростам гэтага паказчыка на 1—2 працэнты і вывядзеннем яго ў 2000 годзе на ўзровень 20—30 працэнтаў, як у найбольш прамыслова развітых краінах.

3. Не адкладваць на 1992—1993 гады, а ўжо ў 1991 годзе павялічыць заработную плату работнікам вышэйшай школы ўсіх катэгорый у два разы.

4. Прыняць закон аб індэксацыі заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых і тэхнічных работнікаў вышэйшай школы ў адносінах 1:0,7.

5. Тэрмінова вырашаць пытанне аб выдзяленні вышэйшым навучальным установам г. Мінска ўчасткаў пад індывідуальную забудову для таго, каб такім чынам знізіць надзвычай вострую жыллёвую праблему для іх работнікаў.

Па даручэнню старшыняў прафкомаў БДУ імя У. І. Леніна, БТІ імя С. М. Кірава, МДПІЗМ, БДІНГ, МДПІ імя А. М. Горкага

Старшыня Савета прафкомаў,
старшыня прафкома БПІ
І. Я. РУХЛЯ.



Масквічы прыехалі да нас парадаваць тутэйшых аматараў сюра і хохмаў. Выстава «Ад лубка да інсталяцыі» адкрылася ў Палацы мастацтваў. Ля ўвахода вас сустрэне «неапазнаны ідэалагічны аб'ект», а далей — чакаюць самыя неверагодныя сюрпрызы.

Фота С. ГРЫЦА.

Для тых, хто адсутнічаў

# На чыім баку прафком?

*Няшмат часу прайшло з тое пары, як, застаўшыся пад ранейшай шыльдай, прафсаюзы вырашылі змяніць сутнасць сваёй дзейнасці. Памкнуліся стаць больш смелымі. Пажадалі самастойнасці і незалежнасці.*

*У гэты пераходны перыяд змянілася шыльда на дзвярах прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў універсітэта. Якім будзе прафсаюзны камітэт у новых умовах?*

*Прапануем вашай увазе інтэрв'ю з новым старшынёй прафсаюзнага камітэта*

*Анатолем Васільевічам ПАЎЛАВЫМ.*

**— Анатоль Васільевіч, прафсаюзная работа для Вас — справа новая. Ці маеце намер праводзіць якія-небудзь карэнныя пераўтварэнні? А магчыма будзеце стараннымі вучнем свайго папярэдніка?**

— Змены ў прафсаюзнай арганізацыі універсітэта абавязкова адбудуцца. І не толькі таму, што ўзначальвае яе сёння іншы чалавек. Перамен патрабуюць людзі, іх прадвызначае сама грамадска-палітычная абстаноўка ў краіне і рэспубліцы. Яшчэ год назад наш прафсаюзны камітэт не згаджаўся з прапанаванай гарвыканкомам сістэмай размеркавання дэфіцытных і па тых часах халадзільнікаў, тэлевізараў, пральных і швейных машын. Наўрад ці хто мог тады прадбачыць, што прафком будзе забяспечваць эканамічную абароненасць супрацоўнікаў універсітэта, займаючыся непасрэдна нават размеркаваннем прадметаў паўсядзённага попыту. А цяпер няма больш каму ўскласці на свае плечы гэтую функцыю. Хоць, падкрэсліваю, слова «размеркаванне» несправядлівае само па сябе. Няма такіх сітуацый, калі адзін мае права на атрыманне «прадмету раскошы», а другі — не.

Прафком звярнуўся ў Маскоўскі райвыканком з просьбай аб пастаноўцы універсітэцкай арганізацыі ў чаргу на атрыманне тавараў. Мы, на жаль, трапілі толькі ў другі спіс. Наш нумар — 153. Для даведкі: да сярэдзіны снежня ДУМ атаварыў толькі 39 арганізацый.

Яшчэ праз некалькі месяцаў, у гэтым, пэўна, дапаможа ўвядзенне рыначных адносін, магчыма, размеркавальная функцыя і ўвогуле адамрэ.

Асабістыя планы ствараю пакуль толькі на 11 месяцаў — да наступнай справаздачна-выбарчай канферэнцыі. Зразумела, змяніць ўсё карэнным чынам не змагу. Ды і не бяру за мэту.

Што ж датычыць майго папярэдніка, буду імкнуцца па яго прыкладу захаваць незаплямленай сваю рэпутацыю.

**— Што можа ўсемагутны прафсаюз?**

— Як дапамагчы аднаму канкрэтнаму чалавеку, калі ўзніклі ў яго канфліктныя адносіны з адміністрацыяй, я ведаю. Грунтоўна вывучыць сітуацыю. Без згоды прафкома звольніць з работы супрацоўніка немагчыма. Як абараніць 6 тысяч членаў прафсаюза? Першы крок да канструктыўнай работы па абароне іх інтарэсаў — фінансавая самастойнасць. Гэта дазволіць прафсаюзам быць больш смелымі і абсалютна незалежнымі. Пры бюджэце 140 тысяч гэта амаль немагчыма.

Другі крок — кансалідацыя шляхам стварэння Асацыяцыі старшыняў прафкомаў ВНУ Мінска, прапановы якой павінна будзе ўлічваць Міністэрства народнай адукацыі.

**— Зразумела, на 140 тысяч, нават калі ў работнікаў універсітэта ўзнікла жаданне забаставаць у знак пратэсту, доўга не пратрымаешся...**

— Наогул да крайніх мер я стаўлюся адмоўна, не прымаючы сам метад. Можна падпісацца пад пунктам патрабаванняў таго ж старшага выкладчыка кафедры агульнай хіміі Канстанціна Лапко. Але ці разумна «змагацца» за дэпалітызацыю? Сустрэчны іск можа выдвінуць, скажам, выкладчык якой-небудзь з грамадазнаўчых кафедраў. Так і адказваць галадоўкай на галадоўку? Калі ацэньваць гэта пытанне з розных пунктаў гледжання, яно датычыць тысячы людзей. І не іх у тым віна, што змянілася сітуацыя ў краіне. Іх інтарэсы я, як старшыня прафкома, павінен абараняць.

**— А калі ўсё ж абставіны «справакуюць» забастоўку выкладчыкаў вышэйшай школы. На чыім баку будзе прафком?**

— Зразумела, супрацоўнікаў універсітэта. Хоць спачатку паспрабуем выкарыстаць усе магчымасці мірнага ўрэгулявання канфлікту, існуючыя ў цывілізаваным грамадстве. А каб непаразуменняў было як мага менш, я гатовы часцей наведваць падраздзяленні універсітэта і запрашаю ў прафком усіх, каму неабходна падтрымка.

Гутарыла
З. МАРАВА.

# РАСАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ ІСНУЮЦЬ

За меркаванні і вывады, выказаныя ў матэрыялах гэтай паласы, за дакладнасць фактаў нясуць адказнасць аўтары — канадскія журналісты Дэвід ГАЗАРД і Кен ШМАЛЬЦ. Наведаўшы Савецкі Саюз, яны апублікавалі ў студэнцкай газеце універсітэта Калгары «Гонтлет» серыю матэрыялаў аб нашым жыцці-быцці.

Павярхоўных?

Занадта катэгарычных?

Звышперадузятых?

Магчыма.

Толькі і самі мы даўно ўжо не жывём з заплюшчанымі вачыма. Дык давайце ж пазнаваць сябе нават у непрыемна крывых адлюстраваннях.

Для вас перакладалі з ангельскай Вераніка БЯГУН и Марына ЗАГОРСКАЯ.

Насуперак мэтам безкласавага грамадства, дзе ўсе людзі роўныя, расізм усё ж такі, існуе ў Савецкім Саюзе.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе кожны дзесяты студэнт — замежнік, трымаецца даволі высокая напружанасць у адносінах паміж белымі і каляровымі студэнтамі. Па словах аднаго з белых студэнтаў Вадзіма Буката, афрыканскіх навучэнцаў у Мінску часам называюць нягоднікамі. Букат растлумачыў гэта тым, што гэтыя студэнты маюць дачыненне да спраў «чорнага рынку». Ён сцвярджаў, што большасць афрыканцаў, якія вучацца ў Савецкім Саюзе, маюць амерыканскую валюту і карыстаюцца магчымасцю абменьваць яе на «чорным рынку» як у 5 разоў даражэйшую за афіцыйны курс. Акрамя таго, у іх ёсць магчымасць купляць цудоўныя тавары ў магазіне «Бярозка», дзе ўсё прадаецца толькі за валюту.

Гэтыя абставіны робяць Савецкі Саюз, мабыць, адзінай краінай у свеце, дзе чорныя мяняюцца месцамі з белымі па сацыяльным становішчы — у афрыканцаў тут яно больш надзейнае.

Аляксандр Віктаравіч Шарапа, прарэктар БДУ, адмовіў існаванне расавых праблем паміж чорнымі і белымі студэнтамі. Але прызнаў, што пэўныя цяжкасці ёсць. Па яго словах, расізм у СССР не ідэалогія, але ж у чалавечых адносінах рознае здараецца.

Жанчына ў СССР

## РУХ ФЕМІНІСТАК НЕ ПРЫНЯТЫ

«Жанчыны ў Савецкім Саюзе лічацца асобамі другога гатунку»,— сказала нам адна студэнтка Маскоўскага універсітэта, якая не захацела назваць сябе.

Яна сцвярджае, што афіцыйна мужчыны і жанчыны роўныя, але ў рэальным жыцці адрозненні ў эканамічным і сацыяльным становішчы палоў існуюць. І выказалася супраць распаўсюджанага ў Савецкім Саюзе перакананя, што мужчыны разумныя, а жанчыны — не. Наша субяседніца мяркуе, што феміцкі рух не прызнаны ў яе краіне з прычыны яго незразумеласці для людзей.

Яшчэ яна расказала, што некалі ездзіла ў адну заходнюю краіну і бачыла там шмат літаратуры, прысвечанай фемінізму. Але нічога не купіла — баялася, што афіцыйныя асобы канфіскуюць у яе такія кнігі.

Між тым, маскоўская студэнтка назвала перавагай савецкіх жанчын такую праблему, як аборты. Яны дазволены тут афіцыйна і даступныя для ўсіх жанчын, якія маюць у гэтым патрэбу. Да таго ж, усе мамы, якія працуюць, могуць карыстацца дапамогай дзіцячых садочкаў.

Жанчыны атрымліваюць пасля нараджэння дзіцяці грошы. Але дзяўчына сцвярджае, што гэтай сумы недастаткова для жыцця. Мамам плоцяць толькі 20 рублёў на ўсе выдаткі, у той час, калі толькі кватэрная плата складае ў Маскве — 20—30 рублёў у месяц.

«Жаночыя» і «мужчынскія» прафесіі ў СССР размеркаваны прыкладна, як у Канадзе. У «Аэрафлоце» сярод пілотаў — у большасці мужчыны, сярод сцюардэс — жанчыны. У прамысловай сферы і сярод вадзіцеляў таксі больш мужчын, сярод пакаёвак у гасцініцах і афіцыянтак у рэстаранах пераважаюць жанчыны. Вось толькі сярод тых, хто ўбірае снег, пераносіць багаж і працуе на чыгуначных платформах, у Савецкім Саюзе надзіва многа жанчын.

# «ГОНТЛЕТ»

Расія ў рэтраспектыве:

## «Людзі ёсць людзі»

Старая прымаўка, што ўжываецца даволі часта: «Людзі ёсць людзі» час ад часу прыходзіла ў галаву, калі я быў у Савецкім Саюзе.

Хаця палітычны клімат і эканоміка ў краіне непараўнальна адрозніваюцца ад нашых, заўважна, што савецкія людзі вельмі гасцінныя, надзвычай зацікаўленыя ў тым, каб пабольш даведацца пра Канаду. Я таксама заўважыў, што яны імкнуцца прыняць самы непасрэдны ўдзел у змяненні лёсу ўласнай нацыі і таму ўсё часцей цікавяцца палітыкай. Ужо не памятаю, колькі разоў давялося адказваць на пытанні: «Ці існуе ў вас студэнцкае кіраванне?», «Што вы думаеце пра перабудову?», «Якую пазіцыю займае Канада ў адносінах да Савецкага Саюза?». Як бачыце, пытальнікаў хапіла б на ўсіх маіх суайчыннікаў.

Нават на безалкагольнай дыскатэцы вялася палітычная дыскусія. Да гэтага я ніколі не дадумаўся б!

Савецкія людзі многа чытаюць. Розныя газеты. Пэўна, напатольваюць былы інфармацыйны голад.

Яны маюць патрэбу ў павышэнні жыццёвага ўзроўню. А пакуль таўкуцца ў магазінах, пакуючы ўсё, што з'яўляецца на паліцах. Было для мяне вялікай нечаканасцю, як расхопліваюць яны тавары ў сваіх сувенірных магазінах. Відаць, сувеніры намнога якасней, чым большасць тавараў у звычайных магазінах.

Вось вам меркаванне, выказанае асобнымі людзьмі зусім самастойна: дрэнная якасць тавараў шырокага попыту, наяўнасць палітычнай бюракратыі, якая не спяшаецца штонебудзь змяніць і нізкі ўзровень жыцця. Але на ўсе гэтыя фактары большасць савецкіх людзей амаль не звяртаюць увагі. Рэальна ўяўляючы, што ў Захада нямала эканамічных і палітычных пераваг, яны ганарацца сваім грамадзянствам. Адзін журналіст, які некалькі разоў наведваў Паўночную Амерыку і Вялікабрытанію, запэўніваў мяне, што ён заўсёды вельмі шчаслівы, калі вяртаецца дамоў у Маскву.

Што яшчэ дадаць да такога старажытнага: «Людзі ёсць людзі».

ДЭВІД ГАЗАРД.

## Савецкія магазіны сувеніраў

*Калі пытаюцца, што знайшоў я самым цікавым у Савецкім Саюзе, я звычайна губляюся і не магу адшукаць патрэбныя словы. Усё ў іх культуры, узроўні жыцця, палітычнай і эканамічнай сістэмах настолькі незвычайнае, што цяжка пачынаць.*

З таго часу, як канадскія хакеісты літаральна разбілі савецкіх у 1972 годзе, мы захапіліся імкненнем палепшыць тэхніку нашай гульні, а рускія пачалі працаваць перш за ўсё над фізічнай падрыхтоўкай. Яны заняліся ўдасканальваннем цела так сур'ёзна, што перанеслі гэта на ўсе ўзроўні савецкага грамадства, нават на магазіны. Так я думаў у апошні дзень нашага знаходжання ў Мінску, калі мы, вельмі стаміўшыся, пакідалі магазін сувеніраў.

Пакупкі ў Савецкім Саюзе сапраўды нагадваюць хакейную гульню, якая вядзецца ў імклівым, хуткасным і атакуючым стылі.

Мы пачалі наша турнэ па магазінах, растлумачыўшы студэнту Дзіме, якія суправаджаў нас у ім, што мы хочам купіць, не спыняючыся на дэталях. Першым магазінам, куды ён нас прывёў, быў сувенірны. Тут прадаваліся льняныя сурвэткі і ўпрыгожаныя драўляныя скрыначкі, без якіх, здавалася, беларускія магазіны страцілі б нейкі свой бляск.

Калі мы вырашылі параўнаць сувенірны магазін з іншымі, мы вымушаны былі правесці там лепшую частку свайго дня. Паколькі мы мелі жаданне быць падобнымі на рускіх, якія, здаецца, усе носяць футравыя шапкі, Дзіма вадзіў нас у два буйныя універмагі, дзе нас адразу захапляў паток пакупнікоў. Незалежна ад таго, хацелі мы нешта купіць ці не, мы не маглі выбрацца я яго. Мы адчулі, што вымушаны штурхаць людзей, якія ідуць насустрачці імкнуцца выйсці з магазіна, маючы пакункі. У той жа час мы вымушаны былі сачыць з пільнай увагай за тым, як рухаўся наш гід і перакладчык Уладзімір, бо ён пастаянна рызыкаваў сутыкнуцца з іншымі пакупнікамі, што ішлі наперадзе.

У гэтых буйных універмагах мы плацілі грошы ля прылаўка, дзе куплялі тавар. А вось у больш дробных магазінах, як аказалася, спачатку трэба даведацца, ці ёсць у продажы неабходнае вам, потым прыкінуць у галаве агульны кошт вашай пакупкі, заплаціць за яе ў адным месцы магазіна, а атрымаць тавар у іншым.

Гэта працэдура паўтараецца і ў прадуктовых магазінах. Замест таго, каб выбраць паміж радамі з прадуктамі адзін неабходны, як робяць гэта канадцы ў супермаркетах, савецкія людзі вымушаны заходзіць у розныя аддзелы магазіна, каб купіць напіткі, мяса, рыбу і малочныя прадукты, але спачатку яны яшчэ павінны заплаціць за іх у касе, выстаяўшы чаргу.

Але ўсё гэта я апісваю не для таго, каб даказаць, што рускія праводзяць увесь свой вольны час у магазінах. Я ўбачыў, што чэргі за прадуктамі ў Савецкім Саюзе не даўжэйшыя, чым за півам на гульнях «Калгары Флэймс», і прыкладна такія ж, як за білетамі на гэтыя гульні...

Якія яны?

## САВЕЦКІЯ ГАНАРАЦЦА САБОЙ

Калі наш самалёт прызямліўся ў Маскве, я здзівіўся — такімі падобнымі падаліся мне рускія і канадцы, нягледзячы на ідэалагічную розніцу ў поглядах. Я нават не спадзяваўся апынуцца ў Маскве, але ўяўляў сабе, што людзі там меланхалічныя і падаўленыя гадамі ганенняў і рэпрэсій.

Расчараванне напаткала мяне ўжо ў аэрапорце: энергічных, задаволеных сітуацыяй і жыватворнымі працэсамі перабудовы людзей сустрэў я там. Аказваецца, рускія ў такой жа ступені ганарацца Расіяй, як мы Канадай. І не лічаць капіталістычны шлях пазбаўленнем ад назапашаных праблем.

Праўда, ў Савецкім Саюзе дзяржава кантралюе больш аспектаў жыцця грамадзян, чым у Канадзе. Пра гэта пастаянна напамінаюць людзі ў міліцэйскай форме, помнікі Леніна і чырвоныя сцягі паўсюдна. Але праўда і тое, што савецкія людзі ўспрымаюць гэта як належнае. Яны, пэўна, больш стрыманыя і жыццястойкія, чым канадцы.

Можна не згаджацца з палітычнымі і эканамічнымі асновамі лада жыцця ў Савецкім Саюзе, але мне здаецца, што больш за ўсё здзяйсненню базавага гуманнага прынцыпу перашкаджае ідэалагічны лэйбл.

КЕН ШМАЛЬЦ.




## Школьнікі і акадэмікі, мікра-ЭВМ ураўноўвае вашы шансы

Ад самых складаных разлікаў да электронных гульняў — дыяпазон магчымасцей пераноснага мікракамп'ютэра «Электроніка МК-90»!

ЁН ПАТРЭБНЫ ЎСІМ:

У ШКОЛЕ — для вывучэння асноў інфарматыкі, прычым не трэба ствараць спецыяльныя камп'ютэрныя класы;

У ВНУ — для індывідуальнага складання графікаў, дыяграм, розных вылічэнняў непасрэдна ў аўдыторыі;

У НДІ І КАНСТРУКТАРСКІХ БЮРО — дазволіць хутка выконваць складаныя інжынерныя разлікі, складаць табліцы, чарцяжы і схемы;

У МАШЫНАБУДАВАННІ — МК-90 знойдзе выкарыстанне ў станках з праграмным кіраваннем у якасці кіруючай прылады;

У АВІЯЦЫІ — для пракладкі штурманскага курсу непасрэдна на борце самалёта;

У АХОВЕ ЗДАРОЎЯ — для тэрміновай апрацоўкі медыцынскіх даных далёка ад вылічальных цэнтраў;

У БУДАЎНІЦТВЕ — дапаможа наладзіць аператыўны ўлік паступлення і расходвання матэрыялаў, выконваемых работ, налічэння зарплаты;

У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ — разлічваць рэжымы рацыянальнага кармлення жывёл, нормы ўнясення ўгнаенняў, весці любыя справаздачы;

ДОМА — для цікавых і захапляючых камп'ютэрных гульняў.

Карысным ён будзе для картографаў і геадэзістаў, эканамістаў і бібліятэкараў; паслужыць для рэдактавання тэкстаў, у якасці тэлефоннага і кулінарнага даведнікаў...

ВАЖЫЦЬ МІКРА-ЭВМ УСЯГО 700 ГРАМАЎ, ПРАЦУЕ АД БАТАРЭЕК І ЭЛЕКТРАСЕТКІ.

Мова — Бейсік; інфармацыю захоўваюць зменныя модулі памяці ёмкасцю 10 Кбайт ОЗУ; ёсць унутраная памяць: ОЗУ — 16 Кбайт, ПЗУ — 32 Кбайта; алфавітна-лічбавая інфармацыя выводзіцца на экран у розным маштабе і напрамку. Камп'ютэр звязаны з іншымі прыладамі праз паслядоўны канал абмену інфармацыяй.

Кошт — 1500 рублёў. ПРАДАЕЦЦА ПА БЕЗНАЯЎНАМУ РАЗЛІКУ.

Завод пастаўляе (па дадатковых заяўках) каля 40 вылічальных і 30 іграврых і дэманстрацыйных праграм; неабходныя заказчыкам камплекты праграмнага забеспячэння.

ЗАЯЎКІ ПРЫМАЮЦЦА НА АДРАС: 220600, Г. МІНСК, ЗАВОД «ЭЛЕКТРОНІКА».

УВАГА! У мэтах вывучэння і задавальнення попыту просім зацікаўленыя арганізацыі паведаміць прыкладную патрэбнасць у мікракамп'ютэрах на наступны год.

Тэлефон для даведак: 78-74-41.

РЭКЛАМНАЯ ФІРМА «БЕЛОР».

# СНІД не спіць!

Статыстычныя дадзеныя сведчаць: штогод адбываецца падваенне колькасці захварэўшых і інфіцыраваных СНІДам Калі так будзе працягвацца і надалей, то ўжо ў бліжэйшым будучым пад пагрозай можа аказацца здароўе і само жыццё большай часткі чалавецтва. Тым больш, што ВІЧ-інфекцыя ўжо набыла характар пандэміі — сусветнай эпідэміі.

СНІД смяротны. Няма і да канца тысячагоддзя наўрад ці з'явяцца эфектыўныя вакцыны для яго прафілактыкі і медыцынскія прэпараты для лячэння.

Сёння не выпадкова ў цэнтры ўвагі — праблема «Жанчына і СНІД». Доля жанчын сярод заражаных зласчасным вірусам пастаянна ўзрастае. Па дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя месяц назад у свеце зарэгістравана 288 тысяч 337 выпадкаў захворвання СНІДам. У нашай краіне на сярэдзіну лістапада гэтага года выяўлена 559 інфіцыраваных ВІЧ, каля 400 з іх — жанчыны і дзеці.

Штогод у 33-й гарадской клінічнай бальніцы праходзяць абследаванне да 13 тысяч чалавек, у тым ліку да 4000 замежных студэнтаў. Пры выяўленні вірусаносьбітва ў замежных студэнтаў яны дэпартуюцца на радзіму, а асобы, што мелі палавыя кантакты з імі, праходзяць штоквартальныя абследаванні на ВІЧ на працягу трох гадоў. На жаль, ужо ёсць адна студэнтка, наша суайчынніца, ВІЧ-інфіцыраваная.

Адказы на ўсе канкрэтныя пытанні, што цікавяць вас, можна атрымаць на прыёме ў урача-гінеколага ў 33-й гарадской (студэнцкай) жаночай кансультацыі.

С. ШАБЕКА,
загадчыца жаночай кансультацыі.

# Секс і лёс

*Жармен Грыер лічыцца адной з прадвесніц сексуальнай рэвалюцыі далёкіх 60-х гадоў. Яе тагачасная кніга называлася «Жанчына-еўнух», і ў ёй Грыер выказала памкненне і чаканне таго пакалення жанчын, што змагаліся за роўную з мужчынамі свабоду ў галіне секса. Рэвалюцыя 60-х стала магчымай з прыходам гармальных кантрацэптываў і антыбіётыкаў, якія пазбавілі жанчыну ад страху перад непажаданай цяжарнасцю і венерычнымі захворваннямі. Можна сказаць, што гэтыя два адкрыцці новай тэхналагічнай эры зрабілі сексуальнае вызваленне жанчын рэальнасцю.*

*Але ці выканала гэта рэвалюцыя свае абяцанні? Зараз Жармен Грыер лічыць, што не. У сваёй новай кнізе «Секс і лёс» аўтар даказвае, што ва ўмовах «рэжыму найбольшага садзеяння» і ўседазволенасці становішча жанчыны ў сапраўднасці нават пагоршылася. Яна заклікае жанчын па-новаму падысці да ацэнкі сваёй ролі, стрымлівацца і стрымліваць мужчын, думаць пра сваё цела, як пра каштоўны сасуд і не падстаўляць яго пад небяспеку разбурэння супрацьзачаткавымі пілюлямі і кантрацэптыўнымі прыстасаваннямі накшталт унутрыматачных спіраляў.*

*Жармен Грыер выклікае шок у сваіх чытачак і слухачак, калі гаворыць ім: «Перад спакусамі секса можна ўстаяць, не займайцеся сексам. Лепш ніякага, чым дрэнны секс!» Дададзім — і небяспечны! Таму што кніга пісалася да таго, як СНІД стаў чумой чалавецтва.*

*Сёння мы друкуем урывак з кнігі «Секс і лёс».*

Сёння мы друкуем урывак з кнігі «Секс і лёс».

Для пакалення, якое зняло забарону з кнігі Лоурэнса «Палюбоўнік ледзі Чатэрлей», само сабой зразумела, цнатлівасць не нясе ніякай карыснай функцыі. Тое ж самае пакаленне прыдумала раманы пра працоўных хлопцаў, якія пракладвалі свой шлях наверх праз улонне непадатлівых прадстаўніц эстэблішмента. Яно таксама ўзяло на узбраенне процізачаткавыя таблеткі, прымаемыя аральна. Сюды ж можна дадаць і самую шырокую рэкламу аральна-генітальнага секса, павальнае захапленне якім прывяло да эпідэміі герпесу палавых органаў.

Разам з крахам веры ў палітычныя дактрыны ўзмацнялася вера ва ўсёпранікальны секс. Сама сексуальная рэвалюцыя ператварылася ў своеасаблівую апостальскую артадаксію. На гэтым фоне ўсялякія размовы аб стрыманасці і каштоўнасцях нявіннасці разглядаліся як лухта. Над імі смяяліся, іх крытыкавалі.

На працягу дзесяці гадоў я чытала амерыканскім студэнтам лекцыі на тэму: «Фемінізм і дзетанараджэнне». Звычайна пасля лекцый маладыя і добра адукаваныя жанчыны падыходзілі да мяне са скаргамі на дрэннае самаадчуванне ў выніку прыёму процізачаткавых таблетак, парушэнняў менструацый з-за ўнутрыматачных спіраляў, а таксама страшэннага болю, які давялося вытрымаць у час аборту, і як вынік запаленне пасля няўдалай аперацыі па спыненню цяжарнасці. «Дык ці варта ўсё гэтага?» — пыталася я іх у адказ.

Мае слухачкі былі проста здзіўлены. Няўжо я веру, што «прывабнасць» секса не варта ўсіх гэтых пакут! Тое, што варта, было для іх відавочна само па сабе. Пытанне яшчэ больш бянтэжыла маіх слухачак, калі я спрабавала растлумачыць, што маю на ўвазе не сам секс і палавы акт, а «ўмяшанне» ў складаную анатомію і фізіялогію іх цудоўнага цела, якія мы яшчэ да канца як след не вывучылі. Для іх была незразумелай сама розніца паняццяў «акт» і «ўмяшанне».

Я спрабавала пераканаць дзяўчат у неабходнасці ўмець ацэньваць гэту розніцу. Яны згаджаліся са мной у тым, што аргазм не з'яўляецца нечым вагінальным і вынікам фізічных практыкаванняў. Але ў той жа час яны не маглі сабе ўявіць: як гэта выдзяленне семя можа адбывацца па-за вагінай? Ці няма ў гэтым нечага ненармальнага, дапытваліся яны ў мяне.

Яны, здаецца, верылі, што жанчыны павінны рабіць усё, што ад іх залежыць, каб зрабіць «умяшанне» заўсёды магчымым. Калі я ім пярэчыла, што гэтым яны падстаўляюць пад велізарную небяспеку сваё здароўе і здольнасць да дзетанараджэння, не жадаючы думаць аб альтэрнатыўных метадах і падыходах, яны не разумелі мяне. А калі я яшчэ прапаноўвала ім устрымлівацца ад інтравагінальгага палавога акта, хоць тыдзень кожны месяц, яны пачыналі рыдаць горкімі слязьмі.

Секс не з'яўляецца больш недарэчным сродкам баўлення часу, чым размова. Ці ў крайнім выпадку ён не павінен быць такім. Людзі, відаць, не маюць нічога супраць таго, што чалавечыя пары могуць атрымліваць задавальненне ад шматлікай актыўнасці, прычым, апошняе слова перакладаецца з латыні як «акт жыцця». Яны з задавальненнем выкарыстоўваюць усе формы сексуальнага вопыту. Але калі ўсё выпрабавана, усе парначасопісы і відэафільмы прагледжаны, вібратары адкладзены ўбок, стрыптыз закончыўся, становіцца неабходным «умяшанне» ў жанчыну.

Нягледзячы на ўсе псеўданавуковыя сексуальныя тэорыі нашага адукаванага стагоддзя, усё яшчэ думаецца,



што чалавек павінен займацца фізічным каханнем. Пры гэтым галонай мэтай лічыцца дзетанараджэнне. Адмаўленне несці гэты цяжар і як вынік часовае ці пастаяннае ўстрыманне разглядаюцца сёння як нездароўе, стэрыльнасць, бясплоднасць з усімі зыходзячымі з гэтага вынікамі ў выглядзе грамадскага схаванага ці выдавочнага астракізму.

Пры гэтым заганай нашай сексуальнай рэлігіі прызнаецца Фрэйд. Мы думаем услед за ім, што структура асобы і яе дынаміка цалкам залежаць ад чалавечага лібідо ці сексуальнай энергіі (слова «лібідо» ўтворана ад таго ж старажытнага кораня, што і наша «каханне».— Заўв. перакл.). Пры гэтым Фрэйд апісаў ўніверсальна тыповага гомасапіенс, хоць шмат чаго і не ведаў аб гэтым чалавеку разумным.

Пабочнікі камерцыялізацыі секса запэўніваюць нас, што чалавеку як віду першапачаткова ўласціва павышаная сексуальнасць заўсёды і ўсюды. Але ці так гэта на самой справе? Ці ўсё мы ведаем у гэтым сэнсе?

Вядомы падарожнік пачатку стагоддзя Карл Хайдэр больш трыццаці месяцаў правёў сярод жыхароў даліны Дані. Ён расказваў надзвычай дзіўныя для сваіх сучаснікаў і для нас рэчы. Жыхары гэтай даліны пасля нараджэння дзіцяці свядома і добраахвотна адмаўляюцца ад палавога акта на працягу... чатырох-шасці гадоў! Пры гэтым іх ніхто не прымушае пазбаўляць сябе задавальненняў секса. Проста вось так яны жывуць, такі звычай. Большая частка мужчын пры гэтым не выкарыстоўваюць іншых спосабаў задавальнення палавога пачуцця. Ніхто не выказвае таксама ніякіх прыкмет стрэсу ці прыгнечанасці.

У многіх народаў пасля нараджэння дзіцяці ёсць перыяд устрымання. Проста ў людзей даліны Дані ён найбольш працяглы з усіх сёння вядомых. Звычайна людзі здзіўляюцца, калі ім гаворыш, што еўрапейцы прытрымліваюцца сходнай практыкі. Сапраўды: калі ў маладых сярэдняя частата палавых актаў дасягае ў першы год прыкладна дваццаці ў месяц, то затым яна зніжаецца да чатырох-пяці, карацей, да аднаго разу ў тыдзень. І многія лічаць такі ўзровень сексуальнай актыўнасці даволі нармальным і натуральным.

Здаровы сэнс падказвае нам, што нашы меркаванні аб ролі секса ў многім ілжывыя: мы ведаем, што нежанатыя не страчваюць розум ад думак пра секс, якога яны пазбаўлены ў сваім паўсядзённым жыцці. Мы таксама ведаем, што найбольш поўныя калекцыі парнаграфіі збіраюцца зусім не цнатліўцамі.

Наша грамадства стымулюе інтарэс сваіх членаў да секса пастаянным прад'яўленнем ім тых ці іншых раздражняльнікаў. Мы пастаянна сутыкаемся з адлюстраваннямі саміх сябе як істот сексуальных, з пастаяннымі сексуальнымі запытамі. Чаму ж мы ўспрымаем гэтыя вобразы? Таму што яны цешаць нас. Гэта цешыць наша сацыяльнае «я», таму што мы лічым наша грамадства больш прагрэсіўным, адукаваным і развітым. Кіно, тэлебачанне і рыначная эканоміка праекцыруюць на наш мозг сексуальныя вобразы, фарміруючы яго, вызначаючы стэрэатыпы нашых паводзін і ўспрыняцця рэчаіснасці.

Але паколькі галоўным аб'ектам «сексаэксплуатацыі» ў нашым грамадстве становіцца жанчына, яна нясе ў ім падвоены цяжар: яна ўзбуджае мужчынскае жаданне і вымушана задавальняць яго. Калі ж жанчына аказваецца няздольнай па многіх прычынах задаволіць жаданне мужчыны, шлюб абвяшчаецца мёртвым. І гэта прызнаецца падставай для разводу. І гэта мы называем сексуальнай свабодай!

Некалі ледзі Чатэрлей выклікала грамадскі шок, упрыгожваючы свайго палюбоўніка гірляндамі і робячы гэта на людзях. Сёння яе бязвінныя выхадкі і эксцэнтрычныя паводзіны даўно ўжо запамятаваныя ў тым патоку літаратуры, якая свабодна і шчыра апісвае натуралістычныя дэталі садамазахісцкіх комплексаў, оргіі, групавое згвалтаванне, эксцэсы нарказаніі, выкарыстоўванне розных замяняльнікаў фаласа, якія, відаць, не задавальняе скажоныя запыты і патрабаванні. Сёння фалас адышоў на другое месца перад вібратарам.

Чалавечыя істоты больш сексуальныя за жывёл таму, што ў нас ёсць памяць і разуменне рэчаў і працэсаў. Сексуальнае пачуццё чалавека даўно разышлося з функцыяй дзетанараджэння, таму што людзі памятаюць тое задавальненне, якое яны адчулі ў час акта. І яны пачынаюць шукаць гэта задавальненне дзеля самога здавальнення.

Але, як і з іншымі задавальненнямі, стрыманасць і ўстрыманне ўбудаваны ў саму яго прыроду. Ежа здаецца больш смачнай, калі вы галодныя. Недахоп устрымання і страта кантролю прыводзяць да рэзкага зніжэння задавальнення.

Дрэнны секс падобны да той жа нядобраякаснай ежы, якая атручвае ваш страўнік і душу. Таму лепш устрымацца ад такой ежы.

Памятайце словы вялікага Гандзі: «Заўсёды ёсць межы задавальненням, але няма межаў самаабмежаванню і ўстрыманню».




*— Вам яшчэ рана жаніцца.*
*— А мы разводзімся.*

Ананімнае абследаванне на СНІД праводзіцца ў 33-й студэнцкай паліклініцы, у пакоі № 216. ЧАС ПРЫЁМУ: З 8.00 ДА 19.00 (АКРАМЯ ВЫХАДНЫХ).

Самыя сучасныя супрацьзачаткавыя сродкі прадаюцца ў аптэчным кіёску 33-й студэнцкай паліклінікі, КІЁСК ПРАЦУЕ З 9.00 ДА 19.00 (АКРАМЯ ВЫХАДНЫХ).

Школа прафілактыкі неплануемай цяжарнасці запрашае студэнтак у 33-ю студэнцкую паліклініку (жаночую кансультацыю), у пакой № 221. ЗАНЯТКІ ПРАВОДЗЯЦЦА КОЖНЫ АЎТОРАК З 18 ГАДЗІН І КОЖНУЮ СЕРАДУ З 14 ГАДЗІН.

На базе 6-й клінічнай бальніцы працуе гасразліковае аб'яднанне па правядзенню штучных абортаў. Аддзяленне працуе ўсе дні тыдня, у тым ліку ў выхадныя і святочныя. Плата па прэскуранту — 32 рублі. Пры сабе мець пашпарт і даведку аб праходжанні флюраграфіі.

АДРАС БАЛЬНІЦЫ: вул. Стаханаўская, 7. Тэлефон для даведак 44-19-02. Час работы: з 8.00 да 19.00.

Кансультацыю па сексалогіі юнакі і дзяўчаты могуць атрымаць у гарадскім Цэнтры сексалогіі. ЗВЯРТАЙЦЕСЯ НА АДРАС: вул. Чырвоная, 2. Тэлефон для даведак: 36-62-33.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
20 снежня
Заказ 2033.
Т. 2000 экз.
220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.
Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.